# Раздзел 6. ТЭКСТ

## ТЭМА № 49. Тыпы і стылі маўлення. Спосабы і сродкі сувязі сказаў у тэксце

### 1. Тыпы маўлення

| Апавяданне | Апісанне | Разважанне |
|---|---|---|
| Паведамленне пра падзеі, з'явы, дзеянні: | Апісанне прадмета, з'явы: | Выяўленне пэўных сувязей паміж прадметамі, з'явамі: |
| *Першымі ў вёсцы прачынаюцца не пеўні, якія гарланяць з другой палавіны ночы, а птушкі. Яшчэ не ўзышло сонца, а на вішні ўсчынаюць гамонку вераб'і. Потым прылятае варона, садзіцца на вільчык хаты і доўга, аднастайна каркае. Затым варона знікае, а на змену ёй прыбываюць сарокі. Яны прымошчваюцца на штыкетніку, скачуць з калка на калок, трашчаць. Так пачынаецца раніца.* | *Я гляджу вакол. Да самых хат падышла паводка, заліла паплавы і грады, двары і нізкія вуліцы, выган і зарэчныя лугі; лазнякі і алешнікі, далёкія дубы па самую макаўку ў вадзе. Рудаватая ад леташніх траў і гліністых берагоў паводка гайдаецца, драбіцца і зіхаціць на сонцы, нібы друзачкі разбітых люстэркаў. Куды ні зірнеш, бялеюць чароды гусей.* | *Эх, людзі! Адкуль нашы бяздушнасць, жорсткасць, варожасць да сваёй калыскі? Відаць, найперш – ад духоўнай дэградацыі. Сёння мы з вялікім імпэтам узяліся за ліквідацыю прабелаў у спасціжэнні этыкету, у тым ліку экалагічнага, але нам бы спасцігнуць самы святы этыкет: усе мы – госці! Прыроды. А таму і паводзіць сябе павінны як у гасцях – па-людску.* |
| **Прыём фатаграфавання** | | |
| Некалькі фотаздымкаў (малюнкаў) | Адзін фотаздымак (малюнак) | Немагчыма сфатаграфаваць (намаляваць) |

**!** **Асноўны тып маўлення** вызначаецца ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай тэксту: паведаміць пра падзеі, з'явы, дзеянні (апавяданне), ахарактарызаваць прадмет ці з'яву (апісанне), выявіць пэўныя сувязі паміж прадметамі ці з'явамі (разважанне).
Дапаможа размежаваць тып маўлення прыём фатаграфавання.
У жыцці ўсе тыпы маўлення часцей за ўсё сустракаюцца ў комплексе.

### 2. Стылі маўлення

| Сфера выкарыстання | Задачы маўлення | Стылёвыя рысы | Асноўныя жанры |
|---|---|---|---|
| **ГУТАРКОВЫ СТЫЛЬ** | | | |
| Бытавыя, сямейныя, сяброўскія зносіны. | Абмяняцца думкамі, пачуццямі, інфармацыяй з блізкімі, знаёмымі людзьмі. | Непасрэднасць, натуральнасць маўлення. Адносіны да прадмета маўлення выражаны. | Бытавая гутарка, размова, паведамленне ў мэсанджары і інш. |
| **КНІЖНЫЯ СТЫЛІ** | | | |
| **1. Навуковы стыль** | | | |
| Асвета, навука (падручнікі, навуковыя працы, выступленні і паведамленні на навуковыя тэмы). | Паведаміць дакладныя звесткі і факты, якія маюць тэарэтычнае значэнне, растлумачыць іх. | Дакладнасць, доказнасць, лагічнасць выкладу. Адносіны да прадмета маўлення не выражаны. | Навуковы артыкул, рэферат, манаграфія, энцыклапедыя, артыкул у падручніку і інш. |

| Сфера выкарыстання | Задачы маўлення | Стылёвыя рысы | Асноўныя жанры |
|---|---|---|---|
| **КНІЖНЫЯ СТЫЛІ** | | | |
| **2. Афіцыйны стыль** | | | |
| Афіцыйныя зносіны, справаводства, заканадаўства. | Паведаміць звесткі, якія маюць практычнае значэнне, даць дакладныя парады, указанні, рэкамендацыі. | Прадпісальны характар маўлення, дакладнасць, стандартызаванасць. Адносіны да прадмета маўлення не выражаны. | Закон, пастанова, указ, дагавор, аб'ява, заява, аўтабіяграфія, характарыстыка, рэзюмэ, даведка, распіска, даверанасць і інш. |
| **3. Мастацкі стыль** | | | |
| Творы мастацкай літаратуры і вуснай народнай творчасці. | Вобразна, маляўніча апісаць які-небудзь прадмет ці з'яву, выказаць свае адносіны да іх. | Канкрэтнасць, вобразнасць, маляўнічасць выкладу. Адносіны да прадмета маўлення выражаны. | Проза, паэзія, драматургія. |
| **4. Публіцыстычны стыль** | | | |
| Грамадска-палітычная дзейнасць (газеты, часопісы, выступленні). | Паведаміць інфармацыю, якая мае грамадска-палітычнае значэнне. Уздзейнічаць на думкі і пачуцці людзей. | Эмацыянальнасць, доказнасць, дакладнасць, надзённасць, даходлівасць выкладу. Адносіны да прадмета маўлення выражаны. | Выступленне, артыкул на грамадска-палітычную тэму, рэпартаж, нататка, інтэрв'ю і інш. |

## 3. Спосабы сувязі сказаў у тэксце

**Паслядоўная сувязь**

- 2-і сказ звязаны з 1-м, 3-і – з 2-м і г. д.;
- думка аўтара развіваецца паслядоўна (тое, што ў 1-м сказе было новым, у 2-м становіцца вядомым і г. д.);
- сказы ў тэксце нельга памяняць месцамі:

[ 1 ]. → [ 2 ]. → [ 3 ].

**Паралельная сувязь**

- 2-і, 3-і і г. д. сказы раскрываюць 1-ы (1-ы сказ задае тэму, а ўсе наступныя дэталізуюць агульны малюнак, канкрэтызуюць тэму);
- усе сказы, акрамя 1-га, можна памяняць месцамі:

[ 1 ]. → [ 2 ]. [ 3 ]. [ 4 ]. [ 5 ].

## 4. Асноўныя сродкі сувязі сказаў у тэксце

**1.** Словы-замяняльнікі – **займеннікі і прыслоўі:**

- *Шэры туман павіс над зямлёй.* ***Ён*** *шчыльнай заслонай укрыў наваколле.*
- *Выходзім на журавінавае поле.* ***Тут*** *усё скрозь усыпана чырвонымі ягадамі.*

**2. Злучнікі:**

*Я шчыра дзякую табе, прырода!* ***Але*** *як бы цябе ні любіў, з болем усведамляю, што застаюся ў вялікім даўгу перад табой.*

**6. Адпаведнасць трывальна-часавых форм дзеясловаў:**

***Надышла*** *ноч.* ***Стала*** *вельмі цёмна. На небе* ***загарэліся*** *зоры.*

**7. Аднолькавы парадак слоў** у сказах (напрыклад, выказнік перад дзейнікам):

- *Пайшоў крыгаход. Шуміць Дзвіна.*
- *Шчасліва спявалі птушкі. Весела цвыркалі конікі.*

**3. Сінонімы**, у тым ліку кантэкстуальныя (метафары, рода-відавыя словы, агульны назоўнік – уласны назоўнік):

- *У бярэзніку мы заўважылі* ***зайца****. Ён таксама ўбачыў нас. За секунду* ***палахлівец*** *схаваўся ў гушчары.*
- *Луг усыпаны* ***рамонкамі. Кветак*** *так многа, што месцамі за імі не відаць травы.*
- ***Якуб Колас*** *– класік беларускай літаратуры. Нарадзіўся* ***пісьменнік*** *на Стаўбцоўшчыне.*

**4. Лексічны паўтор (паўтор слоў):**

*Са свайго падарожжа я вынес* ***уражанне****, што лес заселены добрымі звярамі і птушкамі.* ***Уражанне*** *пазней перарасло ў* ***перакананне****. І ніколі за ўсё жыццё я не меў выпадку расчаравацца ў сваім* ***перакананні****.*

**5. Формы аднаго і таго ж слова:**

***Дрэвы*** *стаяць маўклівыя, нібы сонныя. Дзенідзе яшчэ* ***з дрэў*** *злятае апошняе лісце. Зямля* ***пад дрэвамі*** *ўкрыта жоўта-бурым лісцем.*

**8. Аднатыпнасць сінтаксічных канструкцый** (аднасастаўныя і двухсастаўныя сказы, развітыя і неразвітыя сказы і інш.):

*Калі гавораць пра беларускую прыроду, успамінаюць Палессе. Калі гавораць пра багацце нетраў і зямлі беларускай, успамінаюць Палессе. Калі гавораць пра самабытнасць Беларусі, успамінаюць Палессе. Кожны беларус мусіць хоць раз убачыць Палессе, адчуць і зразумець гэты край.*

**9. Словы – арганізатары лагічных сувязей**, а таксама пабочныя словы (*словам, такім чынам, так, па-першае* і інш.):

*Найпрыгажэйшым чалавек бывае тады, калі ён не ведае пра гэта, калі ён не бачыць самога сябе.* ***На жаль****, часцей за ўсё тады, калі яго не бачыць ніхто.*

**10. Няпоўны сказ:**

*На паляну выйшаў лось.* ***Пастаяў, агледзеўся.***